Вольга ЛАБАЧЭЎСКАЯ

# "ГАЛАВА" ДАВЫДГАРАДОЦКА-ТУРАЎСКАЯ: ІКАНАГРАФІЯ, ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І МУЗЕЕФІКАЦЫЯ

*Сярод артэфактаў беларускай народнай культуры, бадай, найбольшую ўвагу з сярэдзіны XIX ст. выклікала "галава", ці "галовачка", — высокі рагацісты галаўны ўбор, які насілі мяшчанкі Давыд-Гарадка, Турава і сялянкі навакольных вёсак на Століншчыне і Тураўшчыне. Жаночае ўбранне такога тыпу выйшла з ужытку ў 1920—1930-я гг., і яго аўтэнтычныя ўзоры амаль не прадстаўленыя ў музеях краіны. Таму асаблівай увагі заслугоўвае гісторыя навуковага інтарэсу да гэтага прадмета адзення. У першую чаргу ён быў абумоўлены незвычайнасцю формы "галавы", непадабенствам да галаўных убораў беларусак і іншых славянскіх народаў.*

У беларускай навуцы апісанню гэтага арыгінальнага галаўнога ўбору прысвечаны толькі энцыклапедычны артыкул М.Раманюка[1] і навуковая публікацыя М.Віннікавай[2]. Таму нам уяўляецца карысным прасачыць гісторыю фарміравання грамадскай і навуковай цікавасці да давыдгарадоцка-тураўскай "галавы" ад сярэдзіны XIX ст., гістарыяграфію і музеефікацыю гэтага прадмета, злучаныя з гісторыяй вывучэння традыцыйнай культуры Палесся.

Першай незвычайны галаўны ўбор зафіксавала ў 1855 г. ураджэнка Палесся, прадстаўніца славутага шляхецкага роду, пляменніца Напалеона Орды, мастачка Хелена Скірмунт. На малюнку "Сялянкі з ваколіц Давыд-Гарадка" з альбома фотакопій яе твораў, які захоўваецца ў Музеі Беларускага Палесся ў Пінску (кп-14822, ф1-2407/49), паказаныя дзве жанчыны сталага ўзросту ў характэрных мясцовых галаўных уборах. Гэты накід з натуры вылучаецца высокімі мастацкімі якасцямі, прываблівае прыгажосцю ліній і створанага вобразу. Варта адзначыць этнаграфічны падыход мастачкі, якая зафіксавала галаўны ўбор з розных бакоў так, што ствараецца агульнае ўяўленне аб яго аб'ёме і выглядзе. Двухфігурная кампазіцыя малюнка ўраўнаважаная, і выявы жанчын запаўняюць усю яго прастору. Адна з жанчын намаляваная ў фас, яна сядзіць, другая стаіць побач справа ў профіль. Асноўную ўвагу прыцягваюць іх высока паднятыя над ілбом галаўныя ўборы ў форме трапецыі, якія абрамлены хвалямі тонкага напаўпразрыстага палатна, якое прапушчана пад барадой, адзін канец вольна ляжыць на плячы, а другі завязаны ззаду ў аб'ёмны вузел і спушчаны долу. Калі абрысы адзення толькі намечаны лініяй, дык твары жанчын і іх галаўныя ўборы дэталёва і аб'ёмна прапрацаваныя штрыхоўкай.

Другая па часе стварэння мастацкая выява давыдгарадчанкі ў характэрным мясцовым уборы "галавы" датуецца 1863 г. Яна была надрукаваная пад назвай "Мяшчанка з Давыд-Гарадка" ў варшаўскім штотыднёвіку "Tygodnik Illustrowany" як ілюстрацыя да артыкула Антонія Бандзкевіча[3] "Пінск і Піншчына"[4]. Гравюра выканана вядомым варшаўскім гравёрам Аляксандрам Рагульскім (1839—1884), піянерам ксіла-



***ЛАБАЧЭЎСКАЯ Вольга Аляксандраўна.***

*Прафесар кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар мастацтвазнаўства, дацэнт. Нарадзілася ў г. Цюмень (Расійская Федэрацыя). У 1977 г. закончыла Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І.Рэпіна ў Ленінградзе. Працавала ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, загадчыкам аддзела мастацтвазнаўства Навукова-даследчай мастацка-эксперыментальнай лабараторыі Упраўлення народных промыслаў у Мінску, вядучым навуковым супрацоўнікам Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры. У 1984 г. закончыла аспірантуру Навукова-даследчага інстытута мастацкай прамысловасці ў Маскве. У 1987 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю, у 2014 г. — доктарскую. Займаецца пытаннямі традыцыйнай мастацкай культуры Беларусі, праблемамі трансфармацыі народнага тэкстылю і інш. Аўтар каля 250 навуковых публікацый, у тым ліку сямі манаграфій.*

графіі ў Польшчы, адным з найбольш яркіх яе прадстаўнікоў, які супрацоўнічаў з выданнямі "Tygodnik Illustrowany" і "Kłosy". Гэта партрэт неназванай давыдгарадоцкай мяшчанкі. Дакладная выява высокага і шматсастаўнога галаўнога ўбору — "галавы" — стварае вобраз годнай, незалежнай і ўпэўненай у сабе жанчыны. Ілюстрацыя вынесена ў пачатак публікацыі і адразу прыцягвае да сябе ўвагу. Артыкул носіць аглядна-гістарычны характар, і толькі напрыканцы аўтар адзначае найбольш адметныя рысы народных касцюмаў на Палессі: "...*Мужчынскія адзначаюцца здзіўляючай сціпласцю і аднастайнасцю, пазбаўлены якой-небудзь аздобы. Жаночыя пры гэтым вылучаюцца разнастайнасцю і нават фантазіяй. Прыводзім тут толькі найбольш выразнае ўбранне, бо на Піншчыне яно амаль у кожнай вёсцы іншае. Найбольш характэрнае без аніякага сумневу, з'яўляецца тое, якое бачыце тут на мяшчанцы з Давыд-Гарадка*"[5].

Невядома, з якога арыгінала была выканана гравюра А.Рагульскага. Верагодна, аўтар артыкула А.Бандзкевіч быў знаёмы з мастачкай Х.Скірмунт, бо згадвае ў публікацыі яе працу — скульптурны алтар для касцёла ў вёсцы Охава (цяпер Пінскі раён), агульны від касцёла прыведзены на ілюстрацыі. Не будзем выключаць, што аўтарам малюнкаў, паводле якіх А.Рагульскі зрабіў гравюры, магла быць Х.Скірмунт.

Цікавасць да Палесся і да адметнага строю мяшчанак Давыд-Гарадка ў сярэдзіне XIX ст. праяўлялі і расійскія аўтары. У 1868 г. у нарысе "Очерки Белорусского Полесья", што з'явіўся на старонках "Вестника Западной России", а на другі год быў надрукаваны асобным выданнем у Вільні, яго аўтар Іван Эрэміч дэталёва апісаў арыгінальную давыдгарадоцкую "галаву": *"В основании его лежит что-то вроде кички или кокошника с кусочком пестрой материи или парчи (у богатых) на передней его части. Эта кичка (называемая головой) обвивается весьма затейливо, роскошно и кокетливо сарпанкой (тонким, жидким куском полотна), концы которой спускаются сзади до пояса"*[6].

У 1882 г. выява мяшчан з Давыд-Гарадка з'явілася на старонках выдання "Живописная Россия", у трэцім томе, падрыхтаваным Адамам Кіркорам. На гравюры "Тыпы мяшчан з Дывыд-Гарадка" адлюстраваны мужчына ў магерцы з люлькай у руцэ, які сядзіць, а леваруч — жанчына ў рост у цёмным адзенні і высокім белым галаўным уборы. А.Кіркор напісаў пра звычай давыдгарадоцкіх мяшчанак: *"На головах носят род высокого кокошника, называемого головой, которого передняя часть украшена цветною материей, а затем кокошник обвивается куском белого холста, которого концы спускаются сзади до пояса, спереди же такой же кусок холста окутывает щеки и уши, а концы загибаются между кокошником и верхнею обвивкою. Точно такой головной убор мы видим на прилагаемом рисунке. Собственно, это типы мещан из Давид-Городка, но женский головной убор совершенно схож с тем, который носят сельские жительницы. Впрочем, оригинальный этот убор уже начинает выходить из употребления"*[7]. Аўтарам малюнка для гравюры быў нехта Падбельскі (імя мастака не ўдалося высветліць), што пазначана ў змесце тома[8].

У 1886 г. у некалькіх нумарах варшаўскага тыднёвіка "Kłosy" быў надрукаваны артыкул польскага літаратара, вандроўніка і этнографа Эдварда Хлапіцкага (1830—1894) "Піншчына: нататкі з пуцявога дзённіка"[9], ілюстраваны гравюрамі, выкананымі паводле малюнкаў з натуры мастака Уладзіміра Замараева[10]. Ксілаграфія для друку з малюнкаў была зробленая вядомым варшаўскім гравёрам Эдвартам Нічам[11]. Кампазіцыя гравюры складзена з выяў палескіх славутасцяў, якія ў свядомасці тагачаснага адукаванага грамадства Польшчы і Расіі асацыяваліся з далёкім Палескім краем: краявід ракі Піна з разлеглымі берагамі, прыстань у Пінску і відарысы яго барочных касцёлаў, вясковыя могілкі з высокімі крыжамі і калодамі-нарубамі, палешукі-сяляне ў характэрных уборах і жанчыны з наміткамі на галовах[12]. Сярод мазаікі палескіх сюжэтаў у гэтай кампазіцыі звяртае на сябе ўвагу выява мяшчанкі з Давыд-Гарадка ў вялікім галаўным уборы. Яна відавочна пазіравала мастаку. Галаўны ўбор дакладна прамаляваны, нават прачытваецца арнамент вышыўкі, перададзеныя складкі сарпанкі пад барадой і на ілбе, бачны адзін яе вольны канец над плячом.

Публікацыі ў польскай прэсе прыцягнулі грамадскую ўвагу да экзатычнага палескага галаўнога ўбору, паспрыялі яго далейшаму вучэнню і музеефікацыі. У 1898 г. палкоўнік расійскай арміі Валянцін Аляксандравіч Машкоў (1852—1922) з вандроўкі на Беларускае Палессе прывёз у Кунсткамеру ў Санкт-Пецярбургу некалькі ўзораў такіх галаўных убораў. Яны за-



*Мяшчанка з Давыд-Гарадка.*
Гравюра А.Рагульскага (Tygodnik Illustrowany. 1863. № 197. S. 260—263).



*Тыпы мяшчан з Давыд-Гарадка.*
Гравюра Падбельскага (Живописная Россия: Отечество наше... Москва, 1882. Т. 3. Ч. 1. С. 349).

хаваліся ў калекцыі Музея антрапалогіі і этнаграфіі імя Пятра Вялікага Расійскай акадэміі навук. Варта сказаць колькі слоў пра збіральніка, дзякуючы якому ў наш час існуе магчымасць вывучаць аўтэнтычныя галаўныя ўборы, прычым, што вельмі важна, у іх поўным складзе і нават у сабраным выглядзе.

В.Машкоў быў членам Рускага геаграфічнага таварыства, і польскі часопіс "Lud" называў яго *"вядомым этнографам"*[13]. У 1892 г. ён быў пераведзены, з Казані на службу ў Царства Польскае, дзе працягваў займацца этнаграфіяй. Машкоў наладзіў сувязі з польскімі этнографамі і збіраў этнаграфічныя матэрыялы розных народаў Расійскай Імперыі. Даследчык друкаваў свае артыкулы ў часопісе "Wisła" на польскай мове і ў іншых перыядычных варшаўскіх выданнях. Адзначым, што ў 1897 г. ён апублікаваў навуковы артыкул пад назвай "Некалькі слоў аб міжнародным галаўным уборы"[14], у якім разгледзеў жаночыя ўборы "тыпу какошніка" ў палякаў, латышоў, эстонцаў, фінаў, шведаў, рускіх. Невыпадкова, што ў этнаграфічным падарожжы па Палессі ён сабраў 7 арыгінальных галаўных убораў у іх поўным складзе ў былым Мазырскім павеце ў вёсцы Альшаны (кал. 415-1, 415-3), мястэчку Тураў (кал. 415-2), вёсцы Хорс (кал. 415-4), вёсцы Белаўша[15] Пінскага павета (кал. 415-6) і яшчэ два ўзоры (кал. 415-7, кал. 415-5), месца паходжання якіх не ўказана[16]. У музейнай дакументацыі прысутнічаюць памылкі лакалізацыі: так, Альшаны і Тураў Мазырскага павета аднесеныя да Гродзенскай губерні, што адзначыла ў сваім артыкуле М.Віннікава, якая, у сваю чаргу, не звярнула ўвагу на адзін з варыянтаў галаўнога ўбору ў згаданай калекцыі (кал. 415-6). Нягледзячы на недакладнасці апісання, навуковая каштоўнасць калекцыі, сабранай В.Машковым, вельмі значная.

Публікацыі пра незвычайны галаўны ўбор з Давыд-Гарадка і Тураўшчыны ў польскім друку XIX ст. мелі свой водгук у даследаваннях Усходняга Палесся Казіміра Машынскага, якія вучоны распачаў напярэдадні Першай сусветнай вайны. У 1925 г. у часопісе "Ziemia" быў апублікаваны яго артыкул "Пра народную культуру Паўднёва-Сярэдняга Палесся", дзе этнограф адзначыў, што Давыд-Гарадок і вакольныя вёскі (Альшаны, Хорск і інш.) вядомыя сваімі дзіўнымі галаўнымі ўборамі жанчын, і пры гэтым падаў спасылкі на публікацыі ў часопісах "Tygodnik Ilustrowany" і "Kłosy"[17]. Публікацыя К.Машынскага вельмі каштоўная тым, што ў ёй надрукаваны два яго ўласныя фotaздымкі жанчыны ў галаўным уборы "галава" пад назвай "Даўні строй у в. Альшаны". На іх мы бачым адну і тую ж жанчыну сярэдняга ўзросту, сфатаграфаваную на першым здымку ў фас, а на другім больш буйным планам (у тры чвэрці ў профіль, што дае магчымасць разгледзець галаўны ўбор у розных ракурсах і дэталях[18]. Ён мае высокі рыдлёўкападобны грэбень, на якім змешчана вышыўка расліннага характару сіметрычна-восевай кампазіцыі, і налобную частку, белая палатніна якой некалькі разоў перакрыжаваная шнурком (верагодна, чорным). У адным выпадку галаўны ўбор абкручаны наміткай (сарпанкай), якая ахінае твар пад барадой, у другім — уся канструкцыя павязаная дадаткова каляровай хусткай з махрамі, канцы якой звязаныя на патыліцы. Здымкі цікавыя яшчэ і тым, што яны зафіксавалі непасрэдны момант палявой работы славутага этнографа. Жанчына пазіруе на камеру, прысеўшы на прызбе ля сцяны хаты, а за ёй, на другім плане бачная купка дзяцей рознага ўзросту, якія з цікавасцю назіраюць за тым, што адбываецца. Рэакцыя дзяцей можа сведчыць і пра тое, што такі дзіўны галаўны ўбор яны штодня не бачылі, бо на той час ён ужо выйшаў з паўсядзённага ўжытку. У сваёй працы "Народная культура славян" К.Машынскі змясціў свой схематычны малюнак рагацістай "галавы", або "пухоўкі", з вёскі Хорск каля Давыд-Гарадка і адзначыў, што ў суседнім Тураве падобны галаўны ўбор замужняй жанчыны мае іншую форму[19].

Найбольш ранняй іканаграфічнай дакументальнай крыніцай для вывучэння рагацістага галаўнога ўбору з'яўляецца фотаздымак "Група сялян Давыд-Гарадка" са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (кп 6785), апублікаваны М.Раманюком[20]. Яго Беларускаму дзяржаўнаму музею 26 кастрычніка 1925 г. падараваў мазырскі краязнаўца Янка Калодкін[21], аб чым сведчыць яго ўласнаручны подпіс на адваротным баку. На групавым фотаздымку бачым шэсць жанчын і двух мужчын рознага ўзросту, якія пазіруюць фатографу на фоне ўваходу ў будынак, ля дзвярэй якога злева змешчана карта Амерыкі. Гэтая дэталь і асаблівасці строяў, у якія апранутыя людзі, дазваляе меркаваць, што здымак зроблены напярэдадні Першай сусветнай вайны. Дзве жанчыны маюць на галовах вялікія "галовы", падвя-

заныя пад барадой хусткамі з махрамі. На старэйшай жанчыне "галава" па сваёй форме адпавядае ўзорам галаўнога ўбору з Давыд-Гарадка, маладзейшая ўбраная ў "галаву" з рыдлёўкападобным рогам і перавязкай шнурком па налобнай частцы, як у жанчын з вёскі Альшаны. На вялікі жаль, аўтар і акалічнасці фотаздымка нам невядомыя. Калі меркаваць, што на ім сфатаграфавана адна сям'я, можна выказаць думку, што "галовы" адрозніваліся формай у адпаведнасці з узростам жанчыны. Старэйшыя насілі больш шырокія "галовы", у аснове якіх быў каркас з шырокім грэбенем (як у МАЭ кал. 415-3), маладзейшыя ў аснове галаўнога ўбору мелі каркасы з прамавугольным грэбенем (як на фота К.Машынскага, МАЭ кал.415-4).

Унікальныя фотаздымкі давыдгарадоцкай мяшчанкі ў старадаўнім галаўным уборы зрабіў у 1912 г. беларускі этнограф Ісак Сербаў, які па заданні Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства праводзіў "фота-этнаграфічную" вандроўку па Палессі. У мястэчку Давыд-Гарадок Мазырскага павета Мінскай губерні, як ён напісаў у справаздачы "Поездка по Полесью летом 1912 г.", яму *"пашчасціла сфатаграфаваць старадаўні нацыянальны касцюм з яго ўпрыгожаннямі і галаўны ўбор — прыгожую высокую кібалку"*[22]. Вядомы два яго фотаздымкі, на якіх зафіксаваныя ў фас і профіль тры жанчыны ў мясцовых строях, старэйшая з якіх, Ганна Бесан 55 гадоў, мае на галаве вялізную "галаву" з шырокім грэбенем, узорыстае навершша з вышыўкай праглядае праз празрыстую накрухмаленую сарпанку. Розныя ракурсы фотаздымкаў, свядома абраныя этнографам, дазваляюць атрымаць поўнае ўяўленне аб канструкцыі, пластыцы і спосабе павязвання галаўнага ўбору, а таксама добра адлюстроўваюць яго ролю ў агульным комплексе адзення. Відавочна, што на той час такі галаўны ўбор ужо выходзіў з ужытку. "Галовы" 30-гадовых жанчын на здымках, як і на некалькіх іншых фота з Давыд-Гарадка, павязаныя накшалт абруча вялікімі крамнымі хусткамі з махрамі[23].

У 1920—1930-я гг. зона бытавання давыдгарадоцка-тураўскай "галавы" была раздзеленая на дзве часткі. Давыд-Гарадок і яго заходнія ваколіцы ўваходзілі ў склад Польшчы, Тураў і наваколле — у склад БССР. Польскія і савецкія даследчыкі вывучалі этнаграфію Палесся наогул і незвычайны галаўны ўбор у прыватнасці ў адпаведных рэгіёнах.

У 1936 г. касцюм мяшчанкі з Давыд-Гарадка папоўніў збор Палескага музея ў Пінску. Захавальнік музея Дзмітрый Георгіеўскі прывёз поўны строй, які складаўся з кашулі, спадніцы, фартуха, плюшавай шнуроўкі, шарсцяной апаяскі, дзвюх нізак караляў і сігнета, а таксама галаўнога ўбору — "падушачкі" і наміткі з мусліну. У калекцыю ўваходзілі і фотаздымкі давыд-гарадоцкіх мяшчанак у традыцыйных мясцовых строях. За ўсю калекцыю музей заплаціў уладальнікам 50 злотых[24].



*Гравюра Э.Ніча для артыкула Э.Хлапіцкага "Піншчына: нататкі з пуцявога дзённіка" па малюнках з натуры У.Замараева.*
(Klosy. 1886. T. XLII. № 1078. S. 122).

З гэтага даваеннага збору ў Музеі Беларускага Палесся ў Пінску захаваліся толькі тры фотаздымкі — "Жанчыны Давыд-Гарадка ў святочных строях" (кп 2495 — 1,2,3). Упершыню іх апублікаваў М.Раманюк у альбоме "Беларускі народны касцюм"[25]. Здымкі выкананы ў атэлье, на іх сфатаграфаваны тры жанчыны. Галаўны ўбор "галава" мае толькі старэйшая жанчына, дзве маладзейшыя жанчыны павязаныя хусткамі з махрамі, дакладна так, як мы бачым на здымках І.Сербава. Здымкі зрабіў у 1930-я гг. прафесійны фатограф Міхаіл Зубей[26], які меў фотаатэлье на цэнтральнай плошчы Давыд-Гарадка. Розныя варыянты павязвання галаўных убораў, адлюстраваныя на фотаздымках, дазваляюць меркаваць, што фотасесія ладзілася з мэтай зафіксаваць даўні давыд-гарадоцкі строй і спосабы нашэння галаўных убораў. На "адзіночным" фотаздымку "галава" на старэйшай жанчыне не падвязаная пад барадой наміткай, на "двайным" дэманструецца традыцыйны варыянт з подвяззю наміткай пад барадой. На "трайным" маладзейшыя жанчыны ў хустках вакол галавы падвязаны яшчэ дадаткова хусткай пад барадой, канцы якой злучаныя на патыліцы.

У 1920—1930-я гг. скарбонку матэрыялаў для вывучэння арыгінальнага галаўнога ўбору папоўнілі са-

вецкія навуковыя і музейныя экспедыцы на Тураўскае Палессе. У калекцыі Расійскага этнаграфічнага музея М.Віннікава выявіла галаўны ўбор "галава", які складаецца са шлемападобнага каркаса-павойніка, чапца з вышыўкай, "рабушкі" з вышыўкай і наміткі (РЭМ кал. 8762-12129) і частку такога ж убору (РЭМ кал. 8767-12123, 12124) з в. Запясочча каля Турава[27]. У апісанні прыведзена інфармацыя, што галаўны ўбор насілі старыя жанчыны ў Тураве і навакольных вёсках Запясочча, Хільчыцы і іншых да 1920-х гг. Гэтыя каштоўныя прадметы паступілі ў Расійскі этнаграфічны музей у 1947 г. з Музея народаў СССР у Маскве. Можна меркаваць, што яны былі сабраныя ў 1930 г. этнографам Н.І.Лебедзевай у экспедыцыі па Мазырскай акрузе БССР, калі яна наведала і вёску Запясочча.

У архіве Расійскага этнаграфічнага музея аўтарам знойдзены звесткі яшчэ пра адзін факт цікавасці этнографаў да старадаўняга галаўнога ўбору. Супрацоўнікі музея А.Я.Дуйсбург і А.К.Супінскі разам з беларускімі этнографамі бралі ўдзел летам 1932 г. у Палескай экспедыцыі па Петрыкаўскім, Жыткавіцкім, Тураўскім, Лельчыцкім раёнах Мазырскай акругі і сабралі шмат цікавага матэрыялу[28]. Натрапілі этнографы і на тураўскую "галаву", да якой мелі *"вялікую навуковую цікавасць"*, аднак не змаглі па нейкіх прычынах яе забраць з сабой. Яна ўяўлялася настолькі каштоўнай, што па вяртанні ў Ленінград у Тураўскі раённы выканаўчы камітэт быў накіраваны ліст з просьбай набыць экспанат і адправіць яго ў музей. Варта прывесці ўрывак, які дае ўяўленне аб важнасці экспаната і яго ацэнкі ва ўмовах савецкага ідэалагічнага ціску. *"Полесская экспедиция 1932 г. встретила у матери гр. Петра Ероша (шоссе на Тонеж) рогатый головной убор, известный под названием "голова". По условиям передвижения убор не был приобретен, несмотря на большой научный интерес с ним связанный (убор является пережитком, идущим с доклассового строя)"*[29]. У лісце выказана просьба набыць экспанат і адправіць яго ў музей накладным плацяжом, а таксама далучана інструкцыя, як сабраць і запісаць звесткі аб назвах асобных частак галаўнога ўбору і асаблівасці яго нашэння.

У сваёй неапублікаванай працы "Пережитки древнего материнского рода по материалам белорусской свадьбы" (1940 г.) А.Дуйсбург выказала меркаванне, што разнастайныя формы галаўных убораў адносіліся да прыкметаў прыналежнасці жанчыны да таго ці іншага роду: *"...А разнообразные фасоны, особенно женских головных уборов, локализованые в разных районах, наводят на предположение, что головные уборы так же, как и другие части одежды, являлись родовым признаком, отличавшим члена одного рода от другого"*[30].

На жаль, у беларускіх музеях аўтэнтычныя давыд-гарадоцка-тураўскія галаўныя ўборы не прадстаўленыя, за выключэннем рагацістага цвёрдага каркаса "галавы" з прашытага ільнянога палатна, бярosты і жгутоў чароту ў зборы Нацыянальнага гістарычнага музея (кп 1336). Ён быў прывезены ў 1959 г. музейнай экспедыцыяй з вёскі Верасніца Тураўскага раёна і перададзены Ф.Т.Тачыла. Цікава, што Мікалай Улашчык у сваіх успамінах аб Палескай экспедыцыі 1927 г., удзельнікам якой ён быў, згадваў, што ў Дзяржаўны музей у Мінску з Турава быў прывезены "павойнік" з вельмі тонкага палатна, які належаў Тэклі Тачыла[31].

Узоры жаночых галаўных убораў з вёсак Церабліčы і Аздамічы Столінскага раёна ўжо ў наш час здолеў сабраць руплівец мясцовай даўніны народны мастак Іван Супрунчык. У Церабліцкім музеі этнаграфіі і побыту захоўваюцца два рагацістыя галаўныя ўборы, адзін з шырокім грэбенем, вышываны каляровым гарусам і шыхтам "рабушкай" і сарпанкай, другі — з рыдлёўкападобным вузкім грэбенем. У свой час да пошукаў гэтага мясцовага рарытэта І.Супрунчыка падштурхнуў даследчык народнага касцюма М.Раманюк, які не раз наведваў вёску. Хросная маці мастака Ірына Паўловіч, якая нарадзілася ў 1913 г., распавядала, што ў дзяцінстве яны гулялі з гэтымі "шапкамі з бярosты", якія ўжо валяліся на гарышчах. Дзеці накладалі іх на галаву і пад вокнамі хат, дзе зімовымі вечарамі жанчыны збіраліся на папрадухі, грукалі ў шыбы ды пужалі іх гэтымі галовамі[32]. На гарышчы адной са старых цэрабліцкіх хат І.Супрунчык і знайшоў такі каркас-абруч з рогам, які па-мясцоваму называўся "галоўка", або "дзюба"[33].

Рэканструкцыі рагацістых галаўных убораў з Давыд-Гарадка і Турава зрабіла для Музея старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі ў канцы 1990-х гг. даследчыца беларускага народнага касцюма М.Віннікава, якая па матэрыялах Музея антрапалогіі і этнаграфіі імя Пятра Вялікага РАН аднавіла цвёрдыя каркасы і чапцы з вышыўкай[34]. Дзякуючы навукова абгрунтаванай рэканструкцыі, якая абапіраецца на аўтэнтычныя музейныя ўзоры, традыцыйныя касцюмныя комплексы з арыгінальнымі галаўнымі ўборамі былі ўведзеныя ў сучасны культурны кантэкст, пашырылі веды і ўяўленні грамадства аб разнастайнасці лакальных варыянтаў беларускага народнага касцюма[35].

Агляд гістарыяграфічных, іканаграфічных і музейных крыніц, што датычацца рагацістага давыдгарадоцка-тураўскага галаўнога ўбору з мясцовымі назвамі "галава", "галовачка", "лямец", "падушачка" сведчыць аб працяглай гісторыі грамадскай і навуковай цікавасці да яго — з сярэдзіны XIX ст. і да нашых дзён. Асаблівую каштоўнасць мае ўнёсак краязнаўцаў і этнографаў Польшчы, Расіі і Беларусі, якія да 1930-х гг. ва ўмовах, калі "галава" імкліва выходзіла з ужытку, здолелі зафіксаваць, апісаць, музеефікаваць гэты старадаўні галаўны ўбор. Абагульненне назапашаных імі матэрыялаў дазваляе нам больш дакладна акрэсліць тэрыторыю бытавання "галавы". Яна ўключае давыд-гарадоцкую (Давыд-Гарадок, Аль-

шаны, Хорск, Цераблічы, Белаўша) і тураўскую (Тураў, Запясочча, Верасніца, Хільчыцы) зоны, кожная з якіх мае свае асаблівасці ў форме каркаса галаўнога ўбору ("пухоўка", "падушачка", "рогі", "дзюба"). У наш час важны ўнёсак у вывучэнне і папулярызацыю палескага рагацістага галаўнога ўбору зрабілі беларускія даследчыкі М.Раманюк і М.Віннікава. Разам з тым актуальным застаецца праблема больш грунтоўнага вывучэння семантыкі і параўнальнае гісторыка-культурнае даследаванне паходжання давыдгарадоцка-тураўскай "галавы" ў кантэксце развіцця форм галаўных убораў славян і іншых народаў.

[1] Раманюк М. Галовачка // Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мінск, 1989. С. 134.

[2] Винникова М.Н. О реконструкции смыслового значения и способов ношения женских головных уборов Туровщины (по материалам белорусской коллекции МАЭ) // Сборник Музея антропологии и этнографии имени Петра Великого Российской академии наук. Санкт-Петербург, 2011. Т. 57: Культурное наследие народов Европы. С. 93–110.

[3] Антоній Бандзкевіч (Antoni Bądzkiewicz) (1830—1893) — паланіст, гісторык літаратуры, педагог. Нарадзіўся на Міншчыне. Падчас напісання артыкула выкладаў у гімназіі ў Вільні.

[4] Bądzkiewic A. Pińsk i Pińszczyzna // Tygodnik Illustrowany. 1863. № 197. S. 260.

[5] Там жа. S. 263.

[6] Эремич И. Очерки Белорусского Полесья. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://sources.ruzhany.info/048_1.html#byt_poleshukov. Дата доступу: 01.03.2020.

[7] Киркор А.К. Долина Припяти // Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье. Мінск, 1993. С. 349.

[8] Там жа. С. V.

[9] Chłopicki E. Pińszczyzna, notatki z teki podróżnej // Kłosy. 1886. T. XLII. № 1078. S. 113, 120, 123; № 1079. S. 140; № 1080. S. 149–150.

[10] Уладзімір Замараеў (Włodzimierz Zamarajew) — польскі мастак і ілюстратар, атрымаў адукацыю ў Кракаўскай мастацкай вучэльні, у 1886—1895 гг. ілюстраваў варшаўскія часопісы.

[11] Эдвард Ніч (Edward Nicz) (1851—1916) — польскі гравёр-ксілограф, у 1869—1900 гг. супрацоўнічаў з варшаўскімі часопісамі "Tygodnik Illustrowany", "Kłosy", "Wędrowec".

[12] Chłopicki E. Pińszczyzna, notatki z teki podróżnej // Kłosy. 1886. T. XLII. № 1078. S. 122.

[13] Машков Валентин Александрович [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://www.wikiwand.com/ru/Мошков,_Валентин_Александрович/. Дата доступу: 03.03.2020.

[14] Moszkow W. Słów kilka o jednym z międzynarodowych ubiorów głowy // Wisła. 1897. T. 11. C. 316—325; 493—502.

[15] У музейным вопісе пазначана "вёска Бамчуша", што з'яўляецца няправільным расчытаннем назвы в. Белаўша ў Столінскай воласці Пінскага павета з рукапісу збіральніка.

[16] Электронныя вопісы калекцый Музея антрапалогіі і этнаграфіі імя Пятра Вялікага РАН (Кунсткамера).

[17] Moszyński K. O kulturze ludowej Południowo-Środkowego Polesia // Ziemia. 1925. R. X. nr. 8. S. 121.

[18] Там жа.

[19] Moszyński K. Kultura ludowa słowian. 2 wyd. T. I: Kultura materialna. Warszawa, 1967. S. 412.

[20] Архіў Палескага музея. Спр. 2, арк. 252, іл. 224.

[21] Янка Калодкін — краязнаўца з Мазыра, прымаў удзел у краязнаўчым руху 1920-х гг., у археалагічных раскопках на Мазыршчыне. Яго імя згадвае М.Улашчык ва ўспамінах пра экспедыцыю на Тураўшчыну 1927 г.: Николай Улащик. Записки о скитаниях в 1924—1929 годах. Туровщина [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.palese.by/2010/01/Nikolaj-ULASHHIK-Zapiski-o-skitaniyax-v-1924-1929-godax-TUROVSHHINA/. Дата доступу: 9.03.2020.

[22] Лабачэўская В.А. Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава 1911—1912 гадоў = The Belarusians in the photos of by Isaac Serbau = Baltarusiai Isako Serbovo metų fotografijose. Мінск, 2012. С. 269.

[23] Там жа. С. 270—275.

[24] Архіў Палескага музея. Спр. 2, арк. 252.

[25] Раманюк М. Беларускае народнае адзенне. Мінск, 1981. Іл. 219, 222.

[26] Міхаіл Аляксеевіч Зубей (1902—1970), з 1931 г. вучыўся ў Пінскай фоташколе, атрымаў званне майстра.

[27] Винникова М.Н. О реконструкции смыслового значения и способов ношения женских головных уборов Туровщины (по материалам белорусской коллекции МАЭ). С. 104.

[28] Отчёт научного сотрудника А.Дуйсбург о Полесской экспедиции. 23 октября 1932 г. // Архив Российского этнографического музея в Санкт-Петербурге. Ф. 2, оп. 1, д. 414.

[29] Черновик письма в м. Туров БССР, районный исполнительный комитет // Архив Российского этнографического музея в Санкт-Петербурге. Ф. 2, оп. 3, д. 252, л. 32.

[30] Дуйсбург А.Я. Пережитки материнского рода по материалам полесской свадьбы. 1940 г. // Архив Российского этнографического музея в Санкт-Петербурге. Ф. 2, оп. 2, д. 161, л. 31.

[31] Николай Улащик. Записки о скитаниях в 1924—1929 годах. Туровщина [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.palese.by/2010/01/Nikolaj-ULASHHIK-Zapiski-o-skitaniyax-v-1924-1929-godax-TUROVSHHINA/. Дата доступу: 09.03.2020.

[32] Лабачэўская В.А. Палескія былі ў творах Івана Супрунчыка. Мінск, 2012. С. 36—37, 42.

[33] Винникова М.Н. О реконструкции смыслового значения и способов ношения женских головных уборов Туровщины (по материалам белорусской коллекции МАЭ). С. 108—109.

[34] Віннікава М., Богдан П. Традыцыйны беларускі касцюм: альбом. Мінск, 2016. С. 183—184.

# “Галава” давыдгарадоцка-тураўская: іканаграфія, гістарыяграфія і музеефікацыя”

*(да матэрыялу Вольгі Лабачэўскай)*





*“Даўні строй у вёсцы Альшаны”.*
Фота К.Машынскага. 1925 г.

*Каркас жаночага рагацістага галаўнога ўбору — “галава”, “дзюба” (палатно, бяроста, чарот)* — з вёскі Цераблічы Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.
Канец XIX — пачатак XX ст.
Цераблíцкі музей этнаграфіі і побыту І.Супрунчыка.
Фота В.Лабачэўскай.





*Сялянкі з ваколіц Давыд-Гарадка.*
Малюнак Хелены Скірмунт. 1855 г.
Музей Беларускага Палесся ў Пінску (кп14822, ф1-2407/49).